УДК 947.6(=411.6) (1914/1916)

# БЕЛАРУСКІ ТЭАТР У ГАДЫ ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

**М.В. Цуба[1], Н.М. Цуба[2]**

[1]Палескі дзяржаўны ўніверсітэт, cubanm05@rambler.ru

[2]Сярэдняя школа № 14 г.Пінска

Напярэдадні Першай сусветнай вайны на нашых землях мела месца распаўсюджванне так называемых беларускіх вечарынак. У іх прымала ўдзел творчая інтэлігенцыя, студэнты, рамеснікі, сяляне. Беларускія вечарынкі мелі сінтэтычны характар: у іх праграму ўваходзілі спектаклі, харавыя і сольныя песні, танцы, выступленні чытальнікаў. Вядома, што адна з першых такіх вечарынак адбылася пры падтрымцы газеты “Наша ніва” 12 лютага 1910 года ў Вільні, у якой удзельнічалі тэатральныя дзеячы Ф.Аляхновіч, А.Бурбіс, Ф. Мурашка, хор пад кіраўніцтвам Л.Рагоўскага, танцавальны калектыў на чале з І.Буйніцкім. Дадзеная вечарынка, якая праводзілася ў клубе чыгуначнікаў, сабрала каля 1000 гледачоў. [1, с.460-461] Пашырэнне падобныя беларускія вечарынкі набылі перад самай вайной і на яе пачатку. Яны адбыліся ў Гродна, Полацку, Слуцку, Нясвіжы, Капылі, Давід-Гарадку, Радашковічах, Глыбокім і многіх іншых гарадах і мястэчках. Гледачы з хваляваннем успрымалі спектаклі свайго тэатра, блізкага і разумелага ім, у рабоце якога актыўны ўдзел прымалі беларуская паэтэса Цётка і вядомы грамадскі дзеяч Алесь Бурбіс [2, с.146]. Апошні, дарэчы, зрабіў вялікі ўклад у развіццё беларускага тэатра ў ваенны час. А.Бурбіс з’яўляўся душой калектыва і, як правіла, чытальнікам на многіх беларускіх вечарынах, шмат увагі надаваў арганізацыі драматычных гурткоў. У Вільні ў 1915 годзе менавіта ім была пастаўлена п’еса Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча “Сватаўство”, якая мела істотны поспех.



Репозиторий ПолесГУ

Значную ролю ў развіцці беларускага прафесійнага тэатра падчас вайны (1914-1916гг.) адыграў Беларускі музычна-драматычны гурток у Вільні. Удзельнікі гэтага гуртка А. Бурбіс, З. Бядуля, А. Ляжневіч, П. Мядзёлка, А. Пашкевіч (Цётка), Л. і Ч. Родзевічы , Л. Рагоўскі, М. Шыла, і інш. наладжвалі вечары нацыянальнай культуры, ставілі спектаклі, вялі асветніцкую дзейнасць, прапагандавалі народныя песні, танцы, творы беларускай драматургіі [3, с.382-383].

Вялікай падзеяй у культурным жыцці Вільні з'явілася адкрыццё тут 1 чэрвеня 1916 г. Беларускага клуба, у рамках якога быў арганізаваны аматарскі тэатр, які налічваў 60 асобаў і меў сцэну ва ўласным распараджэнні. Станаўленне віленскага нацыянальнага тэатра звязана з імем Ф. Аляхновіча, што спалучаў у сабе таленты драматурга, рэжысёра і акцёра [4, с.128]. Спачатку за антыцарскі артыкул у гумарыстычным часопісе ён пападае ў Вільні на год у турму. Там піша сваю першую беларускую п'есу, а пасля выхаду на свабоду працягвае працаваць у гэтым накірунку і становіцца вядомым беларускім драматургам. У аснове рэпертуару былі п'есы самога Ф. Аляхновіча – "На Антокалі", "Бутрым Няміра", "Манька", Я. Купалы – "Паўлінка", Э. Ажэшкі – "Хам" і іншыя.

У Мінску адным з такіх пунктаў, які аб'ядноўваў беларускіх тэатральных дзеячаў, пісьменнікаў, паэтаў, мастакоў, публіцыстаў і іншых культурных дзеячаў, з'яўлялася "беларуская хатка", створаная па ініцыятыве Мінскага аддзела "Беларускага таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны". Яна размяшчалася ў сталовай гэтага таварыства ў доме пад нумарам 18 па Захараўскай вуліцы каля Чырвонага касцёла [5, с.133]. У яе рабоце таксама, як і ў працы таварыства, прымалі актыўны ўдзел тэатральныя дзеячы Уладзіслаў Галубок, Усевалад Фальскі, вучоны Аркадзь Смоліч, архітэктар Лявон Дубяйкоўскі, літаратары – Ядвігін Ш. (Антон Лявіцкі), Змітрок Бядуля, Арнольд Паўлавіч, Язэп Фаработкa, Рамуальд Зямкевіч, а таксама пазней вядомыя дзеячы беларускага нацыянальнага руху – Язэп Лёсік, Фабіян Шантыр, Зоська Верас, Людвіка Сівіцкая. Ванда Лявіцкая і іншыя [6, с.149]. У шматлікіх культурна-асветніцкіх мерапрыемствах, якія рыхтавала і праводзіла "Беларуская хатка", былі адлюстраваны сацыяльна-вострыя і актуальныя праблемы грамадскага і палітычнага жыцця беларускага народа. У "Беларускай хатцы" былі пастаўлены п'есы Я.Купалы, К.Каганца, інсцэніравана паэма "Тарас на Парнасе" і інш. Усё гэта садзейнічала распаўсюджванню прагрэсіўных настрояў сярод шырокіх слаёў насельніцтва, узмацняла працэс кансалідацыі рэвалюцыйна-дэмакратычных сіл у беларускім нацыянальна-вызваленчым руху [7, с.47].

У неспрыяльных умовах ваеннага ліхалецця беларускія тэатральныя дзеячы, улічваючы ў якім становішчы апынулася беларускае насельніцтва, ў сваіх выступах часта высмейвалі і крытыкавалі самадзяржаўе, але ў той жа час падтрымлівалі мерапрыемствы ўрада, накіраваныя на дабрачынную дапамогу пацярпелым ад вайны.

З-за выкарыстання беларускай мовы на афішах вечароў тэатральныя артысты мелі праблемы з царскай паліцыяй. Царскія улады непрыхільна ставіліся да паказу са сцэны твораў на беларускай мове, асабліва на вострыя сацыяльныя тэмы і часта забаранялі спектаклі. Тым не менш, спектаклі па рознай злабадзеннай тэматыцы ставіліся і карысталіся вялікім поспехам не толькі ў гледачоў на беларускіх землях, але і па-за іх межамі.

Напрыклад, для беларускіх бежанцаў тэатральныя выступленні наладжваліся ў Пецярбургу, Маскве, Ніжнедняпроўску, Тамбове, дзе бралі ўдзел Б. і К. Эпімах-Шыпілы , Цётка, П. Мядзёлка, Я. Каспяровіч, Л.Заяц, І. Буйніцкі і іншыя.

Як правіла ставіліся драматычныя спектаклі па п'есах "Паўлінка" Я. Купалы, "Модны шляхцюк" К.Каганца, "Не розумам сцяміў, а сэрцам" К. Вясёлага, "Пашыліся ў дурні" М.Крапіўніцкага, "Разумны і дурань" І.Карпенкі-Карагі, "У зімовы вечар", "Хам" Э.Ажэшкі. У ваенны час амаль усе спектаклі насілі дабрачынны характар, на сабраныя сродкі аказвалася дапамога беларускім бежанцам, параненым, салдацкім сем'ям [8, с.131].

Яркую старонку ў гісторыі беларускага тэатра ў гады Першай сусветнай вайны ўпісаў такі вядомы драматург, як Ігнат Буйніцкі. Ён меў сяброўскія і творчыя стасункі з Янкам Купалам, Якубам Коласам, Элізай Ажэшкай, Змітраком Бядулем, Цёткай (якая сама ўдзельнічала ў спектаклях трупы як актрысы). Яшчэ пры жыцці яго называлі бацькам беларускага тэатру. Ігнат Буйніцкі упершыню вывеў "мужыцкі" танец на сцэну, як выканаўца і пастаноўшчык паказаў невычарпальныя магчымасці і прыгажосць беларускіх народных танцаў. Як драматычны акцёр выступаў пераважна ў характэрных ролях, умела выяўляў гумар і тонкую іронію. Тэатру увесь час даводзілася пераадольваць прыдзіркі цэнзуры і ўсялякія перашкоды мясцовых уладаў, якія бачылі ў дзейнасці трупы пагрозу вялікадзяржаўнай палітыцы царызму.

На пачатку вайны дзейнасць трупы прыпынілася, а сам Ігнат Буйніцкі быў заклікаены на вайсковую службу ў Маладзечна. Менавіта ў Маладзечна ён пачынае займацца салдацкай мастацкай самадзейнасцю. На самым пачатку 1917 года І. Буйніцкі з'яўляецца стваральнікам прафесійнага тэатра ў Мінску – Першага беларускага таварыства драмы і камедыі, якое стала папярэднікам тэатра імя Янкі Купалы. Ігнат Буйніцкі падтрымліваў свой тэатр уласнымі сродкамі. У рэпертуары тэатра акрамя танцаў і песен былі пастаноўкі п'ес "Па рэвізіі" і "Пашыліся ў дурні" Маркі Крапіўніцкага, "Хам" і "У зімовы вечар" паводле Элізы Ажэшкі, "Міхалка" братоў Далецкіх, "Сватанне" Антона Чэхава, "Модны шляхцюк" Каруся Каганца, Янкі Купалы, Альберта Паўловіча і інш. У большасці гэта былі былі пастаноўкі І.Буйніцкага, таксама ён іграў у ролях.

У рэпертуары групы налічвалася больш за дзясятак танцаў ("Лявоніха", "Юрка", "Варабей", "Мяцеліца", "Гняваш", "Мельнік", "Антошка", "Чобат", "Качан", "Чабор", "Полька" і інш.). Музычнае суправаджэнне ладзіў традыцыйны "траісты ансамбль" – цымбалы, скрыпка, дуда. Вядомы імёны выканаўцаў-музыкаў – І.Голер, І. Маскаленка (цымбалы), А.Шульга (дуда), якія выступалі ў гастролях трупы. Адначасова І.Буйніцкі старанна адбіраў для сваіх выступаў народныя песні. У гэтым яму дапамагаў кампазітар Л.Рагоўскі і хор майстар трупы Я.Феакцістаў. Напрыклад, хорам выконваліся такія песні, як "Дуда-весялуха", "Ах ты дзьмі", "Падушачка", "За гарамі, за лясамі", "Ох ты дуб", "Прыляцелі гусі", "Ды куды ж ты, дуб зялёны" і іншыя. Фактычна прысвяціўшы ўсё сваё жыццё беларускаму тэатру, Ігнат Буйніцкі памёр на сцэне падчас рэпетыцыі 22 верасня 1917 года [9, арк. 1].

Развіццё і пашырэнне беларускай тэатральнай самадзейнасці адбывалася і пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 года. Вядома, што ў Мінску, Слуцку, Будславе, Ліпніках, Дукоры і іншых мясцінах ствараліся культурна-асветныя гурткі, якія падчас вечарынак паказвалі спектаклі, выконвалі беларускія песні.

Будучы ў цяжкім становішчы, наколькі дазвалялі магчымасці, беларуская тэатральная эліта імкнулася нават ва ўмовах ваеннага часу весці пэўную работу, скіраваную на маральна-культурную падтрымку беларусаў, як на тэрыторыі нашага краю, так і ў бежанскай масе па-за яго межамі. Прадстаўнікі беларускага тэатра штораз мянялі і пашыралі рэпертуар, знаходзілі новыя падыходы, формы і метады сваёй дзейнасці. Даволі актыўна імі выкарыстоўваліся створаныя у ходзе вайны розныя дабрачынныя таварыствы. У ваенных абставінах праца на культурнай ніве разам з матэрыяльнай і маральнай дапамогай пацярпелым ад вайны, паступова ўсё больш набывала грамадска-палітычную афарбоўку. Але галоўнае, карыстаючыся вялікай папулярнасцю, беларуская драматургія дапамагала абуджэнню нацыянальнай самасвядомасці нашага народа, яго цягі да культуры, садзейнічала разгортванню беларускага адраджэнскага руху, спрыяла станаўленню беларускага прафесійнага тэатра.

### *Спіс выкарыстанных крыніц:*

1.Сабалеўскі, А.В. Беларускія вечарынкі / А.В. Сабалеўскі // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. / рэдкал.: М.В.Біч [і інш]. – Мінск : БелЭн, 1993. – Т. 1. А – Беліца – С.460–461.

2.Найдзюк, Я. Беларусь учора і сёння: Папулярны нарыс з гісторыі Беларусі / Я. Найдзюк, І. Касяк. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 414 с.

3. Сабалеўскі, А.В. Беларускі музычна-драматычны гурток / А.В. Сабалеўскі // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі: у 5 т. / рэдкал.: І.П. Шамякін (гал. рэд) [і інш.]. - Мінск: Бел СЭ, 1984. - Т.1 – С. 382-383.

4.Крыжовы шлях / Дапаможнік для вывучаючых гісторыю Беларусі. – Мінск: Згода, 1993. – 240 с.

5.Памятники Минска / Авт.- сост. В.П.Шамов. – Минск: Полымя, 1991. – 208 с.

6.Скалабан, В. В это суровое и важное время: Максим Богданович в Минске / В. Скалабан // Нёман. – 1981, № 12. – С.148-152

7.Сташкевич, Н.С. Приговор революции: Крушение антисоветского движения в Белоруссии (1917-1925) / Н.С. Сташкевич. – Минск: Университетское, 1985. – 304 с.

8.Цуба, М.В. Грамадска-палітычнае жыццё на Беларусі з пачатку Першай сусветнай вайны да Лютаўскай рэвалюцыі (жнівень 1914- люты 1917 гг.). Матэрыял да курса "Гісторыя Беларусі" / М.В.Цуба. – Мінск. – 231 с.

9. Беларускі дзяржаўны архіў – музей літаратуры і мастацтва (БДАМЛіМ) – Фонд 3. – Воп. 1. – С. 101.